Лабковіцкая сельская бібліятэка-музей

# Народны фальклор Лабковіцкай старонкі

(замовы і абрадавыя песні)

2008 г.

# "Замовы"

(Фальклорная спадчына
Лабковіцкага края)

**Замовы — гэта нішто іншае як вера ў сілу слова.**

**Хоць да іх у сёняшні дзень па зразумелых прычынах звяртаюцца радзей, чым у папярэднія часы, аднак і цяпер іх выкарыстоўваюць у асноўным для лячэння разнастайных хвароб, калі ўрачы не ў стане вылечыць хворага.**

**Амаль у кожнай мясцовасці ёсць людзі так званыя "шаптуны", якія ўздзейнічаюць на людзей з дапамогай магічных слоў.**

**Вось некалькі замоў запісаных у нашай вёсцы Лабковічы, са слоў мясцовых жыхароў.**

### Ад зубнога болю

Ой вы зубы, зубы! Чаму ж вы белы, ды руды? Хіба вы што кепска жа-валі, што хваробы дасталі. Перастаньце балеці. А не перастанеце балець, то мы будзем вас жалезамі цягнуці. Ідзі ж ты, хвароба, у шырокае поле, у сухія лясы, ды ў мокрае балота. А хваробы нам жаднай не трэба, бо яна прыйшла ад чорта, але не з неба.

### Ад рожы

Прачыстая маці, на помач устаці. Рожа - маліна, рожа - чарніца, рожа урочная, рожа - спарочная, спавольная, спагаворная, цеплавая, вадзяная, ветраная. Цеплавая на цяпло, вадзяная на ваду, ветраная на вецер - Прачыстая Маці, на помач устаці. Бог на помач.

### На оберег домашней живности

Заговариваю я живое от врагов бродячих, собак кусачих, от укуса змеи, от худобы, от дел колдунов, от глазливых языков. Не считают звезды, а мое добро сочтено. «Аминь»

## Заговор на утихание крови

Два брата камень секут, две сестры в окошко глядят, две свекрови в воротах стоят. Ты свекров, воротись, а ты кровь, утолись. Ты сестра отворотись, а ты кровь уймись.

Ты брат смирись, а ты кровь запрись.

Брат бежит, сестра кричит, свекор ворчит, а будь мое слово крепко, на утихание крови у раба (...) по сей час, по сию минуту!

## От боли в ухе *(шептать в ухо)*

Шла баба до реки, несла три доски. До реки добралась, тут и боль раба (...) унялась. Аминь

## От заикания

*(Наговорить на воду, пусть больной пьет, а вы его слегка бейте по спине правой ладонью и читайте то что на воду наговорили, снова но про себя)*

Речь Господева чиста. Господевы уста говорят не сбиваются, слова не прерываются, так и ты раб (имя) говори не сбивайся и не прерывайся, икогой, моятой. Аминь

## Цвіла рута ў гародзе *(песня)*

Цвіла рута ў агародзе
Чырвоненькім цветам.
Ехаў хлопец да дзяўчыны
Віднюсенькім светам.

- Ці ты чула, дзяўчынычка,
Як я цябе клікаў,
Каля тваіх варотачак
Сівым канем ехаў?

- Ці я чула, ці не чула—
Не адзывалася,
Бо на цябе, мае сэрца,
Не спадзявалася.

- Голуб сізы, голуб сізы
Высока летае.
Няхай таму цяжка жыці
Хто нас разлучае.

## Ці свет, ці святае *(лірычная песня)*

Ці свет, ці світае,
Ці на зоры займае,
А мой міленькі, голуб сізанькі,
Коніка сядлае.

Сядлай мілы, каня,
Сядлай варанога
Прыязджай мілы, не кідай, мілы,
Мяне маладую

Ці ж я не акая
Ды як тая другая?
Я й харошая, я й прыгожая -
Толькі доля ліхая.

А ў полі азярца,
Там плавало вядзерца.
Ой прыйдзі, мілы, мы парадзімся
Мае мілае сэрца!

Ты пойдзеш гарою,
А я даліною.
Людзі кажуць мне, я й сама знаю,
Што не жыць нам с табою

## Як памерла матулька

Як памерла матулька,
Ажаніўся татулька,
Ды паслалі сірацінку
У сыр-бор па малінку.

А ўжо сонца заходзіць
Сірата не прыходзіць
- Выйдзі, бацька, паглядзі ты
На сваю сірацінку.

Там стаяла каліна,
Пад калінай магіла,
Там сіротка хазіла,
Сваю мамку будзіла,

- Ой, устань, устань мамка,
Цябе кліча дзіцятка
Рашчашы мне галоўку
Ды памый мне сарочку

## Пайшла Каляда калядуючы

Пайшла каляда калядуючы.
Эй, каляда!

А за ёю дзеўкі шчадруючы.
Пайшла каляда ў адну хату,
А ў гэтай хаце куццю таўкуць.
Пайшла каляда ў другую хату,
А ў гэтай хаце серабро звініць.
Пайшла каляда ў трэцюю хату,
А ў трэццяй хаце сала шыпіць.
Эй, каляда!

Пайшла каляда ў чацвёртую хату,
І ў гэтай хаце сала шыпіць.
Пайшла каляда ў пятую хату,
А ў пятай хаце золата блішчыць,
Пайшла каляда ў шостую хату,
А ў шостай хаце каўбасу пякуць.
Каўбасу пякуць, ды і нам дадуць,
Хоць па маленечкаму кусочку,
Каб любілі хлопцы вашу дочку
Ой, каляда!

## Ішла Купала сялом, сялом…

Ішла Купала сялом, сялом,
Закрыўшы вочкі пяром, пяром
На Йвана Купала.

Закрыўшы вочкі пяром, пяром,
Вітала хлопцаў чалом, чалом,
На Йвана Купала

Вітала хлопцаў чалом, чалом,
Свяціла ночкі агнём, агнём
На Йвана Купала.

Свяціла ночкі агнём, агнём
Пляла вяночкі шаўком, шаўком
На Йвана Купала

Пляла вяночкі шаўком, шаўком
Слыла Купалка с цяплом, дабром,
Славу Купалу пяём, пяём.